Н.М. Антановіч (Мінск)

Асаблівасці рэалізацыі білінгвальнага падыходу ў навучанні беларускай арфаграфіі малодшых школьнікаў

У сацыялінгвістычнай сітуацыі руска-беларускага двухмоўя, якое склалася на Беларусі, асаблівае значэнне набывае фарміраванне моўнай асобы праз арганізацыю паўнацэннага білінгвальнага навучання і выхавання. Ідэальнай мэтай такой адукацыі з пазіцыі лінгвадыдактыкі павінна стаць фарміраванне прадуктыўнага, збалансаванага, нарматыўнага двухмоўя.

Важнейшай асаблівасцю беларускай і рускай моў з'яўляецца тое, што гэта мовы блізкароднасныя. «Справа не толькі ў генетычнай роднасці, – адзначае А. Я. Супрун, – але і ў гранічнай блізкасці сістэм беларускай і рускай моў, якая выпрацавалася на базе генетычнай роднасці ў выніку ўзаемных уплываў і паралельнага развіцця некаторых элементаў» [3, с. 15]. У значнай ступені гэта датычыцца гукавой, граматычнай, лексічнай сістэм.

Пры вывучэнні дзвюх блізкароднасных моў значную ролю адыгрывае перанос элементаў і заканамернасцей адной мовы на другую. З аднаго боку, перанос спрашчае засваенне блізкароднасных моў, але з другога – выклікае дадатковыя цяжкасці. Пры выкарыстанні ў маўленні на другой мове элементаў, якія супадаюць або часткова супадаюць, ажыццяўляецца станоўчы перанос – транспазіцыя. Калі выкарыстанне элементаў роднай мовы прыводзіць да парушэння норм у маўленні на другой мове, мае месца адмоўны перанос – інтэрферэнцыя.

Вынікі спецыяльна праведзенага даследавання праблемы фарміравання арфаграфічнай пісьменнасці малодшых школьнікаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання сведчаць аб тым, што большасць арфаграфічных памылак вучняў выклікана інтэрферэнцыяй [1]. Патрабуецца спецыяльная работа па іх карэкцыі. Для гэтага ў першую чаргу неабходна вызначыць тэарэтычныя падыходы да навучання беларускай арфаграфіі ва ўмовах руска-беларускага білінгвізму.

На нашу думку, у якасці аднаго з найважнейшых падыходаў пры навучання беларускай арфаграфіі ў сітуацыі руска-беларускага двухмоўя можна назваць білінгвальны падыход. Рэалізацыя названага падыходу прадугледжвае апору на веды, уменні і навыкі, набытыя на ўроках рускай мовы, вызначэнне правільнай сувязі з арфаграфіяй рускай мовы. У тым выпадку, калі не ўлічваць і не ўстанаўліваць сувязей паміж арфаграфічнымі сістэмамі беларускай і рускай моў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фарміраванне многіх арфаграфічных навыкаў будзе ўскладняцца, навыкі адной сістэмы будуць змешвацца з навыкамі другой сістэмы.

Выпрацоўка арфаграфічных уменняў і навыкаў на ўроках беларускай мовы ў школах з рускай мовай навучання адбываецца паралельна ці, як правіла, пасля фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў па рускай арфаграфіі. Наяўнасць станоўчага і адмоўнага пераносу пры вывучэнні дзвюх моў вылучае ў якасці актуальнай праблему выкарыстання метадычных прыёмаў супастаўлення і параўнання пры навучанні беларускай арфаграфіі ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.

Многія вучоныя-метадысты (А. Я. Супрун, А. І. Уласенкаў і інш.) указваюць на эфектыўнасць выкарыстання ў метадычна апраўданых выпадках названых прыёмаў у працэсе навучання блізкароднасным мовам. Педагагічная эфектыўнасць супастаўленняў і параўнанняў пры навучанні другой мове не толькі не супярэчыць дадзеным псіхалогіі і псіхалінгвістыкі, але і пацвярджаецца імі. Устаноўлена, што перанос навыкаў і ўменняў з роднай мовы на няродную мае месца незалежна ад нашых спроб абмежаваць яе ўплыў. Аднак пры блізкароднасным білінгвізме «апора на родную мову для выбару неабходнай з’явы магчыма толькі ў тым выпадку, калі вядома, што яна на самай справе забяспечыць неабходную правільнасць» [3, с. 65].

Названыя вышэй прыёмы блізкія, але не тоесныя. Мы разглядаем прыём параўнання з’яў блізкароднасных моў як спосаб выяўлення найперш агульнага паміж імі. У такім выпадку згаданы прыём ёсць спосаб рэалізацыі арганізаванай транспазіцыі. Адзначаны метад мае на мэце паслядоўны і мэтанакіраваны перанос ведаў, уменняў і навыкаў, атрыманых на ўроках рускай мовы, у вучэбную і моўную практыку на беларускай мове пры вывучэнні з’яў, якія супадаюць у абедзвюх мовах. Калі пэўныя моўныя факты ў беларускай мове маюць такое ж або больш шырокае распаўсюджанне, чым у рускай, то апора на веды і навыкі па рускай мове і параўнанне адпаведных фактаў у блізкароднасных мовах прывядзе да станоўчага выніку. Пры гэтым веды, уменні і навыкі па рускай мове, якія падлягаюць пераносу, неабходна сфарміраваць правільна і трывала. Толькі ў такім выпадку яны могуць служыць апорай для арганізаванай транспазіцыі.

У лінгвадыдактыцы выкарыстоўваецца супастаўляльны метад вывучэння моў. А.М. Шчукін разглядае яго як спосаб выяўлення разыходжанняў паміж фактамі дзвюх моў [5]. Такім чынам, супастаўленне як прыём рэалізацыі гэтага метаду прадугледжвае

мэтанакіраваны аналіз фактаў дзвюх блізкароднасных моў з мэтай вызначэння дыферэнцыяльных, адметных прымет.

Супастаўленне можа садзейнічаць засваенню як падобных з'яў, так і з'яў, якія ў рускай мове адсутнічаюць. Неабходна адзначыць, што ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму ў працэсе навучання на першае месца павінны выступаць тыя з'явы, якія невядомы з урокаў рускай мовы або тыя, якія з'яўляюцца спецыфічнымі ў параўнанні з рускай мовай. Такім чынам, супастаўленне можа быць выкарыстана для вырашэння метадычных задач, звязаных з нейтралізацыяй інтэрферэнцыі.

У метадычнай літаратуры вылучаюць дзве формы супастаўлення – скрытае і адкрытае. У методыцы навучання беларускай мове ў школах з рускай мовай выкладання выкарыстоўваюцца абедзве формы супастаўлення.

Скрытае (імпліцытнае) супастаўленне фактаў дзвюх моў рэалізуецца пры распрацоўцы праграм, падручнікаў, метадычных дапаможнікаў. Вынікі такога супастаўлення ў працэсе выкладання не праводзяцца непасрэдна, а ўлічваюцца шляхам спецыяльнай увагі да тых з'яў, якія падвяргаюцца інтэрферэнцыі. Мэтазгоднасць скрытага супастаўлення з'яўляецца агульнапрынятай з'явай.

У вучэбнай праграме па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання адзначаецца, што «фарміраванне ў вучняў уяўленняў пра сістэму беларускай мовы адбываецца з апорай на веды, атрыманыя з рускай мовы, шляхам супастаўлення і параўнання» [4, с. 86]. Вывучэнне беларускай мовы як другой пачынаецца з падрыхтоўчага перыяду (I клас, вусны курс). У I класе малодшыя школьнікі авалодваюць фанетыка-арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускай мовы. Гэта з'яўляецца апорай для далейшага свядомага засваення правіл беларускай арфаграфіі.

У II класе навучанне беларускай мове пачынаецца раздзелам «Уступны моўны курс», падчас вывучэння якога адбываецца азнаямленне з графіка-арфаграфічнымі асаблівасцямі беларускай мовы. У падручніку змешчаны практыкаванні, якія прадугледжваюць супастаўленні, напрыклад [2, с. 23]:

практ. 43. Разгледзьце малюнкі. Скажыце, хто на іх намаляваны. Прачытайце беларускія словы.

Воўк, леў, жураўлі.

Якім гукам адрозніваецца вымаўленне рускіх і беларускіх слоў? Якой літарай абазначаецца гэты гук?

Далей сістэматычны курс беларускай мовы прадстаўлены наступным чынам: у першую чаргу для засваення малодшым

школьнікам прапаноўваюцца спецыфічныя арфаграфічныя факты і факты, якія найчасцей падвяргаюцца інтэрферэнцыі.

Адкрытае супастаўленне мае на мэце непасрэдны зварот на ўроках беларускай мовы да фактаў рускай мовы, выкарыстанне спецыяльных практыкаванняў, якія патрабуюць свядомага параўнання моў. Неабходнасць правядзення адкрытых супастаўленняў пацвярджаецца назіраннямі псіхолагаў і лінгвістаў. У свядомасці вучняў непазбежна адбываецца супастаўленне фактаў другой мовы і роднай. Пры гэтым неабходна, каб супастаўленне было свядомым, метадычна мэтазгодным. Вырашаць пытанне аб дарэчнасці супастаўлення і яго характары неабходна ў дачыненні да кожнага канкрэтнага выпадку.

Некаторыя практыкаванні, змешчаныя ў падручніках па беларускай мове, прадугледжваюць арганізацыю адкрытых супастаўленняў на ўроку, напрыклад [2, с. 64]:

практ. 127. Прачытайце.

па-руску	па-беларуску
автобус	аўтобус
травка	траўка
кладовка	кладоўка

Якімі гукамі адрозніваюцца словы, напісаныя па-руску і па-беларуску? Спішыце беларускія словы. Падкрэсліце літару **ў** разам з папярэдняй літарай. Пасля якіх літар пішацца **ў**?

Пры навучанні блізкароднасным мовам неабходна ўлічваць, што параўнанні і супастаўленні не павінны быць пастаяннымі, а толькі ў якасці асобных элементаў (прыёмаў) метадычный сістэмы, якая выкарыстоўваецца. Рэалізацыя білінгвальнага падыходу прадугледжвае ўстанаўленне такіх сувязей паміж беларускай і рускай арфаграфіяй, пры якіх міжмоўныя арфаграфічныя перашкоды будуць менш значнымі, а ў шматлікіх выпадках стануць апорай для фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў на другой мове.

Як ужо адзначалася, апора на веды і навыкі па рускай арфаграфіі можа прывесці да інтэрферэнцыі, калі ў беларускай мове пэўныя факты менш распаўсюджаны, чым у рускай. Эфектыўным шляхам нейтралізацыі інтэрферэнцыі з’яўляецца арганізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў, арыентаванай на ўсведамленне асаблівасцей рускай і беларускай моў. Таму пры навучанні беларускай арфаграфіі ў сітуацыі руска-беларускага білінгвізму неабходна, з аднаго боку, фарміраваць механізмы новых арфаграфічных дзеянняў, а з другога — размяжоўваць механізмы, якія абслугоўваюць беларускае і рускае пісьмо. Як заўважае А. Я. Супрун, сістэма навучання другой мове павінна ажыццяўляцца так, каб яна

«складвалася як аўтаномная сістэма» [3, с. 33]. Важна, каб выпрацоўвалася дыферэнцыяльная маўленчая ўстаноўка на карыстанне блізкароднаснымі мовамі.

Такім чынам, рэалізацыя білінгвальнага падыходу пры навучанні беларускай арфаграфіі ў пачатковых класах ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання дазваляе папярэдзіць памылкі, выкліканыя інтэрферэнцыяй, і ажыццяўляць станоўчы перанос ведаў, уменняў і навыкаў, набытых на ўроках рускай мовы.

Літаратура

1. Антановіч, Н. М. Арфаграфічная пісьменнасць вучняў пачатковых класаў устаноў адукацыі з рускай мовай навучання / Н. М. Антановіч, М. Г. Яленскі // Пачатковая школа. – 2012. – № 12. – С. 42–47.

2. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 2-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / В.І. Свірыдзенка. – Мінск : НІА, 2010. – 112 с.

3. Супрун, А. Е. Содержание обучения русскому языку в белорусской школе / А. Е. Супрун. – Минск : Вышэйшая школа, 1987. – 230 с.

4. Учебные программы для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения: I–IV классы. – Минск : НИО, 2011. – С. 85-99.

5. Щукин, А. Н. Лингводидактический энциклопедический словарь : более 2000 единиц / А. Н. Щукин. – Москва : Астрель: АСТ: Хранитель, 2008. – 746 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ